Мінсувязі выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель «Дзень работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі»

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель «Дзень работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі», які будзе выкарыстоўвацца з 18 па 21 красавіка 2023 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння.

Месца гашэння – Мінск-паштамт.

Колер масцікі – сіні.

7 мая – Дзень работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі. Свята ўстаноўлена Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 157 ад 26 сакавіка 1998 года.

Гэты дзень увайшоў у гісторыю сусветнай навукі і тэхнікі як дзень нараджэння радыё. Менавіта 7 мая далёкага 1895 года рускі фізік Аляксандр Сцяпанавіч Папоў ажыццявіў першы сеанс радыёсувязі і прадэманстраваў свету першы радыёпрыёмнік.

З таго часу радыёсувязь прайшла велізарны шлях у сваім развіцці, і сёння тэхналогіі сувязі з’яўляюцца адной з галоўных частак нашага жыцця.

Да гэтай падзеі РУП «Белпошта» падрыхтавала мастацкі маркіраваны канверт з літарнай маркай «А».

Дызайн спецштэмпеля і канверта Марыны Віткоўскай.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/node/8363*